СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК

# АБІТУРЫЕНТ-2000

# Гродзенскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • № 6 (277) • 7 мая 2000 года, нядзеля

Выходзіць адзін раз на месяц • Распаўсюджваецца бясплатна

## ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ — 60

**КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ**

Паважаныя выкладчыкі, навуковыя супрацоўнікі, аспіранты і студэнты!

Сардэчна віншую вас з 60-годдзем Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

Прыемна ўсведамляць, што за невялікі гістарычны перыяд ваша ўстанова ператварылася ў аўтарытэтны адукацыйны, навуковы і культурны цэнтр, у якім авалодваюць ведамі і навыкамі каля 10 тысяч студэнтаў і аспірантаў, а вучэбна-выхаваўчы працэс забяспечваюць 1300 педагогаў, вучоных і супрацоўнікаў. Калектывам набыты цікавы вопыт навучання па новых спецыяльнасцях з улікам патрэбнасцей рынку працы, прадпрыемстваў і арганізацый вобласці. Універсітэт уносіць важкі ўклад у развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы навукі і адукацыі.

У цэнтры ўвагі педагагічнага калектыву і надалей павінны быць праблемы асваення і ўкаранення сучасных тэхналогій навучання, удасканальвання структуры, павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі і грамадзянскага выхавання спецыялістаў. Зразумела, у сумесным пошуку больш эфектыўных метадаў і сродкаў вырашэння гэтых праблем непазбежны плюралізм поглядаў і інавацыйных падыходаў. Аднак прынцыпова важна, каб укараняемыя новаўвядзенні былі карысным для грамадства і дзяржавы: умацоўвалі прэстыж нацыянальнай сістэмы адукацыі і адлюстроўвалі прагрэсіўным тэндэнцыям развіцця сусветнай вышэйшай школы.

Жадаю вам здароўя, шчасця, дабрабыту і новых творчых поспехаў на ніве адукацыі і навукі.

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**
**4 сакавіка 2000 года**

# СЛАЎНЫ ШЛЯХ

Сёння Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы — буйны навукова-адукацыйны цэнтр рэгіёну, міжнародна прызнаны універсітэт класічнага тыпу. Ён адыгрывае адну з вядучых роляў у навуковым і грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Выпускнікі ГрДУ вядомыя не толькі ў Беларусі, але і далёка па-за яе межамі. У ВНУ атрымалі пуцёўку ў жыццё такія выдатныя людзі, як акадэмік НАН Рэспублікі Беларусь М.П.Касцюк, акадэмік АПН Л.М.Ціханаў, прафесары В.Н.Міхнюк, Ф.М.Янкоўскі, пісьменнікі Аляксей Карпюк, Данута Бічэль-Загнетава, Пятрусь Макаль, заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь Алесь Белакоз.

Праславілі Беларусь выпускнікі ГрДУ, алімпійскія чэмпіёны па гімнастыцы — Алена Валчэцкая і Вольга Корбут, па штанзе — Аляксандр Курловіч, неадназовы чэмпіён Еўропы і прызёр свету па барацьбе Аляксандр Федарэнка, сярэбраны прызёр алімпіяды Пётр Пачынчук, чэмпіён універсіяды па плаванні Ірына Ларычава, футбаліст Сяргей Саладоўнікаў і інш.

Універсітэт — шматпрофільная вышэйшая навучальная установа, у якой дзейнічаюць 10 факультэтаў: псіхалогіі і педагогікі, гісторыі і культуры, біялогіі і экалогіі, фізічнай культуры, матэматычны, фізіка-тэхнічны, філалагічны, юрыдычны, эканомікі і кіравання, гуманітарны. Падрыхтоўка спецыялістаў праводзіцца па 31 спецыяльнасці па трох формах навучання: дзённай, вячэрняй, завочнай — на бюджэтнай і дагаворнай аснове. 4018 чалавек навучаюцца па гуманітарных спецыяльнасцях, у тым ліку правазнаўства — 1809, навуковыя спецыяльнасці — 1536, педагагічныя — 2025, тэхнічныя — 203, эканамічныя — 459. Неабходна падкрэсліць, што ў гэтым пераліку не толькі класічныя спецыяльнасці, але і нестандартныя для універсітэта — гісторыя і культуралогія, вывучэнне замежных моваў і такіх дысцыплін, як лацінская, грэчаская і польская мовы. Агульная колькасць студэнтаў у 1997/98 навучальным годзе склала 8261 чалавек, з іх на дагаворнай аснове навучаліся 2679, дзённай форме навучання — 5260, вячэрняй — 86, завочнай — 2915.



Ва універсітэце абаронена 39 доктарскіх, 1200 кандыдацкіх дысертацый. І цяпер ва універсітэце праходзяць падрыхтоўку 137 аспірантаў, 50 магістрантаў, 110 спашукальнікаў. 3 дактаранты накіраваны ў дактарантуры вядучых ВНУ Рэспублікі Беларусь.

З упэўненасцю можна сцвярджаць, што ў ГрДУ склаўся шэраг навуковых школ, многія яго навуковыя супрацоўнікі з гонарам прадстаўляюць Беларусь за мяжою.

## У XXI СТАГОДДЗЕ - З НАДЗЕЯЙ!

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы, які выконвае высакародную місію - падрыхтоўку высокаадукаваных спецыялістаў, закліканых павысіць навуковы і інтэлектуальны патэнцыял Айчыны - адзначае шасцідзесяцігадовы юбілей.

Ад двух аддзяленняў, на якіх вялася падрыхтоўка настаўнікаў для няпоўных сярэдніх школ у 1940 годзе, да дзесяці факультэтаў, дзе атрымліваюць вышэйшую адукацыю каля дзесяці тысяч студэнтаў, прайшоў калектыў ВНУ свой слаўуты і нялёгкі шлях станаўлення і развіцця.

За гэты перыяд падрыхтаваны больш за 35 тысяч спецыялістаў сістэмы адукацыі, народнай гаспадаркі і культуры. Выраслі новыя пакаленні студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў. Побач з маладымі калегамі і сёння працуюць ветэраны, што закладвалі аснову сённяшняга дня універсітэта. Дзякуй Вам, шаноўныя ветэраны, за шматгадовую плённую працу!

У XXI стагоддзе ГрДУ ўваходзіць сучаснай навучальнай установай. Рэальнае жыццё ўскладвае на плечы нашага універсітэта адказнасць за развіццё менавіта Гродзенскага рэгіёну. Таму універсітэт заўсёды будзе імкнуцца застаца буйнейшым рэгіянальным цэнтрам навукі, адукацыі і культуры. Няма сумнення і ў тым, што ён стане адной з вядучых ВНУ нашай краіны.

Поспехаў Вам, паважаныя абітурыенты, у выбары жыццёвага шляху!

*Рэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, прафесар*
***С.А.МАСКЕВІЧ.***

# ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ – 60

**У сувязі са святкаваннем юбілею на адрас калектыву універсітэта паступіла 83 афіцыйных віншаванні ад устаноў, арганізацый. Больш за 40 фірмаў, прадпрыемстваў разам з віншаваннямі аказалі універсітэту спонсарскую дапамогу.**

### КОЛЛЕКТИВУ ГРОДНЕНСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМЕНИ ЯНКИ КУПАЛЫ

Уважаемые преподаватели, ученые, аспиранты, студенты, сотрудники университета!

Примите искренние поздравления по случаю 60-летия со дня создания Вашего учебного заведения.

Созданный накануне Великой Отечественной войны пединститут, а позже университет прошел большой и славный путь. Сегодня Гродненский государственный университет, которому дано имя великого сына Беларуси Янки Купалы, представляет собой крупнейший региональный центр науки, образования и культуры, осуществляет фундаментальную подготовку специалистов более чем по тридцати специальностям, обеспечивает педагогическими кадрами область и республику. Ваши выпускники сегодня — руководители органов государственного управления, образования, деятели культуры, известные ученые и педагоги. Учебно-воспитательную и научно-исследовательскую работу осуществляет высокопрофессиональный коллектив ученых и преподавателей, большая часть из которых сами являются выпускниками Вашего прославленного вуза.

О значительном международном авторитете Гродненского университета свидетельствуют тесные связи с научными центрами Европы и Америки, проведение многочисленных международных научно-практических конференций, участие в реализации ряда международных программ. Кроме того, университет ежегодно готовит десятки специалистов для иностранных государств.

От всей души благодарим коллектив университета за многолетнюю плодотворную работу и выражаем уверенность и надежду, что и в дальнейшем ему будут свойственны новаторский поиск и самоотверженность в служении гуманному делу образования и воспитания.

Желаем Вам дальнейших творческих успехов, целенаправленности в работе, здоровья и большого личного счастья.

**ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ.
ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ СОВЕТ ДЕПУТАТОВ.
3 марта 2000 года**

### ЕСТЬ МНЕНИЕ!

**В.ГАВРОН, начальник управления образования облисполкома, выпускник Гродненского пединститута:**

70 процентов педагогов области — выпускники нашей Альма-матер. Это хорошо подготовленные специалисты, высокообразованные культурные люди. Желаем и в дальнейшем нашему родному университету держать высокую марку...

### КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Паважаныя навукоўцы, выкладчыкі, работнікі сістэмы адукацыі!

Прыміце мае сардэчныя віншаванні з нагоды 60-годдзя вашай навучальнай установы. Ваш універсітэт стаў цэнтрам навукі, адукацыі і культуры не толькі ў Гродне, але і ў Заходнебеларускім рэгіёне. Шмат знакамітых людзей атрымалі пуцёўку ў жыццё ў сценах Гродзенскага педінстытута, а пасля — і універсітэта. І сёння вы працягваеце слаўныя традыцыі вашага калектыву па падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, якія заклікаaны прысвяціць свае веды і намаганні далейшаму сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёну, росквіту роднай краіны.

Выказваю ўпэўненасць, што вашы багатыя веды і вопыт, вашы шматгадовыя напрацоўкі ў справе падрыхтоўкі кадраў і далей будуць служыць справе развіцця рэгіёну, павышэнню адукацыйнага і культурнага ўзроўню беларускага народа.

У сувязі з юбілеем жадаю вам, шаноўныя, моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і плёну ў вашай нялёгкай справе на карысць Айчыны. Жадаю сённяшнім студэнтам, аспірантам, магістрантам стаць сапраўднымі спецыялістамі. Краіна чакае вас!

**Намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь У.П. ЗАМЯТАЛІН.**

### ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**УЗНАГАРОДЖВАЕ**

калектыў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы за шматгадовую плённую працу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых кадраў і ў сувязі з 60-годдзем з дня заснавання навучальнай установы.

**Люты 2000 года. Міністр В.І.СТРАЖАЎ.**

### ВІНШАВАННЕ

**4 сакавіка 2000 года.**
**г. Мінск**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з выпадку 60-годдзя з дня ўтварэння універсітэта — цэнтра навукі, адукацыі і культуры Заходняга рэгіёну Рэспублікі Беларусь.

У гэты ўрачысты дзень жадаем прафесарска-выкладчыцкаму саставу, студэнтам і выпускнікам універсітэта, іх родным і блізкім моцнага здароўя, вялікага асабістага шчасця, значных творчых дасягненняў, новых поспехаў і перамог.

Выказваем спадзяванне на далейшае плённае супрацоўніцтва ў галіне падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

**Старшыня ВАК Беларусі А.П.ДАСТАНКА.**

### ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА

**Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь**

**УЗНАГАРОДЖВАЕ**

калектыў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы за вялікі ўклад у развіццё фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, выкананне дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і інавацыйных праектаў, падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых кадраў і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня заснавання.

**Старшыня В.А.ГАЙСЁНАК.**

### ЕСТЬ МНЕНИЕ!

**Джон ТОМАС, профессор университета Баффало, США:**

Мой визит в Гродно совпал с вашим юбилеем, и это добрый знак того, что наш совместный проект будет успешным. В третьем тысячелетии мы будем сотрудничать. Вы поступаете правильно, укрепляя связи с местным руководством, промышленностью и бизнесом. У вашего университета — большое будущее.

### ЕСТЬ МНЕНИЕ!

**В. РУСАКЕВИЧ, первый заместитель главы администрации Президента РБ:**

Тридцать лет назад я закончил биолого-химический факультет Гродненского пединститута. Я горжусь этим, потому что здесь я получил прекрасное образование...

### ЕСТЬ МНЕНИЕ!

**Адам ЯМРОЗ, профессор университета Белостока:**

Мы сегодня подписали договор о сотрудничестве, и, я надеюсь, оно будет успешным. Условия у нас, как у партнеров, близкие — два славянских университета, работающих в одном направлении. Я рад за вас, много положительного здесь, и я хотел бы, чтобы у нас университет был, как в Гродно.

### ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА №38

Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь узнагароджвае Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы за вялікі ўклад у справу выхавання моладзі на прынцыпах агульначалавечых маральных каштоўнасцей і ў сувязі з 60-гадовым юбілеем.

**Старшыня камітэта А.М.БІЛЫК.**

**4 сакавіка 2000 года г. Мінск**

### ЕСТЬ МНЕНИЕ!

**Модрис ОЗОЛИНС, представитель Рижской бизнес-школы:**

Я хотел бы высказать наилучшие пожелания от имени Рижского технического университета и его ректора и передать вам адресную грамоту. Надеемся, что сотрудничество будет долгим и полезным!...

# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
# Ў ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ НА 2000 ГОД

**Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы аб'яўляе прыём на:**
**ДЗЁННУЮ, ЗАВОЧНУЮ І ВЯЧЭРНЮЮ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:**

| *Спецыяльнасць (форма навучання)* | *Кваліфікацыя* | *Структура ўступных экзаменаў* | *Прафілі-руючыя прадметы для медалістаў СШ і выдатнікаў ССНУ і ПТНУ* |
|---|---|---|---|
| ***Фізіка*** *(дзённая)* | "Фізік. Выкладчык фізікі і інфарматыкі " або "Інжынер-фізік" | ***профільныя*** – фізіка (вусна). матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Радыёфізіка*** *(дзённая,вячэрняя)* | "Інжынер-радыёфізік" | ***профільныя*** – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Прыборабудаванне*** *(дзённая)* | "Інжынер-оптык" або "Інжынер-электрамеханік" | ***профільныя*** – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялаў*** *(дзённая)* | "Інжынер-механік" | ***профільныя*** – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Матэматыка*** *(дзённая, завочная)* | "Матэматык. Выкладчык матэматыкі" або "Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (пісьмова) |
| ***Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій*** *(дзённая)* | "Інжынер – матэматык – праграміст" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна). беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне)<br>***няпрофільны*** – фізіка (вусна) | матэматыка (пісьмова) |
| ***Прыкладная матэматыка*** *(дзённая)* | "Матэматык-праграміст. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі" | ***профільныя*** – матэматыка (практычная частка – пісьмова), матэматыка (тэарэтычная частка-пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (практычная частка - пісьмова) |
| ***Эканамічная кібернетыка*** *(дзённая)* | "Матэматык-эканаміст" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова). матэматыка (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (пісьмова) |
| ***Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны*** *(дзённая)* | "Эканаміст" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова), замежная мова (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (пісьмова), замежная мова (пісьмова) |
| ***Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве*** *(дзённая: завочная, завочная – на скарочаны тэрмін навучання ў адпаведнасці з Правіламі прыёму)* | "Эканаміст-менэджэр" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова). замежная мова (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (пісьмова) |
| ***Камерцыйная дзейнасць*** *(дзённая. завочная)* | "Эканаміст" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова). замежная мова (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (пісьмова) |
| ***Фінансы і крэдыт*** *(дзённая: завочная; завочная – на скарочаны тэрмін навучання ў адпаведнасці з Правіламі прыёму)* | "Эканаміст" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова), замежная мова (пісьмова). беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (пісьмова) |
| ***Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт*** *(завочная – на скарочаны тэрмін навучання ў адпаведнасці з Правіламі прыёму)* | "Эканаміст" | ***профільныя*** – матэматыка (пісьмова). замежная мова (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | матэматыка (пісьмова) |
| ***Правазнаўства*** *(дзённая, завочная)* | "Юрыст" | ***профільныя*** – чалавек і грамадства (пісьмова), замежная мова (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | чалавек і грамадства (пісьмова), замежная мова (пісьмова) |
| ***Біялогія*** *(дзённая)* | "Біёлаг. Выкладчык біялогіі" або "Біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі" | ***профільныя*** – біялогія (пісьмова), хімія (вусна). беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | біялогія (пісьмова) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Біялогія (завочная)* | "Біёлаг. Выкладчык біялогіі" | *профільныя* – біялогія (пісьмова). хімія (вусна). беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | біялогія (пісьмова) |
| *Экалогія (дзённая)* | "Эколаг-біёлаг. Выкладчык экалогіі і біялогіі" або "Эколаг-хімік. Выкладчык экалогіі і хіміі" | *профільныя* – біялогія (пісьмова). хімія (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | біялогія (пісьмова), хімія (вусна) |
| *Гісторыя (дзённая)* | "Гісторык. Выкладчык гісторыі" або "Гісторык. Выкладчык гісторыі і культуралагічных дысцыплін" | *профільныя* – гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | гісторыя (пісьмова) |
| *Гісторыя (завочная)* | "Гісторык. Выкладчык гісторыі" | *профільныя* – гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | гісторыя (пісьмова) |
| *Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "замежная мова"* *(дзённая)* | "Настаўнік гісторыі, англійскай мовы" або "Настаўнік гісторыі, нямецкай мовы" | *профільныя* – гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна) |
| *Педагогіка і методыка пачатковага навучання з дадатковай спецыяльнасцю "замежная мова"* *(дзённая)* | "Настаўнік пачатковых класаў з правам навучання англійскай мове" або "Настаўнік пачатковых класаў з правам навучання нямецкай мове" | *профільныя* – беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне), замежная мова (вусна), матэматыка (вусна) | беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне), замежная мова (вусна) |
| *Педагогіка і методыка пачатковага навучання з дадатковай спецыяльнасцю "сацыяльная педагогіка"* *(дзённая)* | "Настаўнік пачатковых класаў, сацыяльны педагог" | *профільныя* – беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), гісторыя Беларусі (вусна) | беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) |
| *Сацыяльная педагогіка (дзённая)* | "Сацыяльны педагог, педагог-арганізатар выхаваўчай работы ў навучальных установах" | *профільныя* – беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне). матэматыка (вусна). гісторыя Беларусі (вусна) | беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) |
| *Дэфекталогія (дзённая)* | "Настаўнік дапаможнай школы, настаўнік-лагапед" | *профільныя* – біялогія (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне), гісторыя Беларусі (вусна) | біялогія (вусна) |
| *Педагогіка і методыка пачатковага навучання (завочная; завочная – на скарочаны тэрмін навучання ў адпаведнасці з Правіламі прыёму)* | "Настаўнік пачатковых класаў " | *профільныя* – беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), гісторыя Беларусі (вусна) | беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) |
| *Педагогіка і псіхалогія дашкольная (завочная – на скарочаны тэрмін навучання ў адпаведнасці з Правіламі прыёму)* | "Выхавальнік-метадыст" | *профільныя* – беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна). гісторыя Беларусі (вусна) | беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) |
| *Музыка і спевы (дзённая, завочная)* | "Настаўнік музыкі і спеваў" або "Настаўнік музыкі і спеваў, сусветнай і айчыннай культуры" | *профільныя* – спецыяльнасць, тэорыя музыкі і сальфеджыо (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ), гісторыя Беларусі (вусна) | спецыяльнасць |
| *Выяўленчае мастацтва і чарчэнне (дзённая, завочная)* | "Настаўнік выяўленчага мастацтва і чарчэння" або "Настаўнік выяўленчага мастацтва, чарчэння, сусветнай і айчыннай культуры" | *профільныя* – кампазіцыя, малюнак, беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ), гісторыя Беларусі (вусна) | кампазіцыя |
| *Народная творчасць (дзённая, завочная)* | "Кіраўнік аркестра (ансамбля). Выкладчык музыкі" | *профільныя* – спецінструмент, тэорыя музыкі і сальфеджыо (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ), гісторыя Беларусі (вусна) | спецінструмент |
| *Псіхалогія (дзённая, завочная)* | "Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі" | *профільныя* – біялогія (пісьмова), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне) | біялогія (пісьмова) |
| *Беларуская мова і літаратура (дзённая)* | "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры", або "Філолаг. Выкладчык беларускай і рускай моў і літаратур", або «Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры і рыторыкі», або «Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры, спецыяліст па камп'ютарнай лінгвістыцы», або "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры і англійскай мовы" | *профільныя* – беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна) | беларуская мова (дыктоўка) |
| *Беларуская мова і літаратура ( завочная)* | "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры" або "Філолаг. Выкладчык беларускай і рускай моў і літаратур" | *профільныя* – беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна) | беларуская мова (дыктоўка) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Славянскія мовы і літаратуры* (дзённая) | "Філолаг. Выкладчык польскай мовы і літаратуры і беларускай мовы і літаратуры" | *профільныя* – беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова і літаратура (пісьмова), замежная мова (пісьмова) | беларуская мова (дыктоўка) |
| *Руская мова і літаратура* (дзённая) | "Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры", або "Філолаг. Выкладчык рускай і беларускай моў і літаратур", або "Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры і рыторыкі", або "Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры і рускай мовы як замежнай", або "Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры. Літаратурны работнік" | *профільныя* – руская мова (дыктоўка), руская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна) | руская мова (дыктоўка) |
| *Руская мова і літаратура* (завочная) | "Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры" або "Філолаг. Выкладчык рускай і беларускай моў і літаратур" | *профільныя* – руская мова (дыктоўка), руская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна) | руская мова (дыктоўка) |
| *Англійская мова* (дзённая) | "Настаўнік англійскай мовы. нямецкай мовы" або "Настаўнік англійскай мовы. французскай мовы" | *профільныя* – англійская мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова), англійская мова (вусна), беларуская ці руская мова (дыктоўка) | англійская мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова). англійская мова (вусна) |
| *Нямецкая мова* (дзённая) | "Настаўнік нямецкай мовы, англійскай мовы" | *профільныя* – нямецкая мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова), нямецкая мова (вусна), беларуская ці руская мова (дыктоўка) | нямецкая мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова), нямецкая мова (вусна) |
| *Французская мова* (дзённая) | "Настаўнік французскай мовы, англійскай мовы" | *профільныя* – французская мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова). французская мова (вусна). беларуская ці руская мова (дыктоўка) | французская мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова). французская мова (вусна) |
| *Сучасныя замежныя мовы* (дзённая) | "Філолаг. Выкладчык англійскай і нямецкай моў і краіназнаўства" або "Філолаг. Выкладчык англійскай мовы і рускай мовы як замежнай" | *профільныя* – англійская мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова), англійская мова (вусна), беларуская ці руская мова (дыктоўка) | англійская мова (лексіка-граматычная кантрольная работа – пісьмова), англійская мова (вусна) |
| *Фізічная культура і спорт* (дзённая) | "Настаўнік фізічнай культуры, метадыст па аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры", або "Настаўнік фізічнай культуры . педагог-арганізатар фізкультурна-аздараўленчай работы і турызму". або "Настаўнік фізічнай культуры . педагог-арганізатар фізічнага выхавання ў дашкольных установах" | *профільныя* – лёгкая атлетыка, гімнастыка, біялогія (вусна), беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне), *няпрофільны* – плаванне | лёгкая атлетыка, гімнастыка, біялогія (вусна), плаванне |
| *Фізічная культура і спорт* (завочная) | " Настаўнік фізічнай культуры. педагог-арганізатар фізкультурна-аздараўленчай работы і турызму " | *профільныя* – лёгкая атлетыка, гімнастыка. біялогія (вусна). беларуская ці руская мова і літаратура (сачыненне). *няпрофільны* – плаванне | лёгкая атлетыка. гімнастыка. біялогія (вусна), плаванне |
| *Цеплагазазабеспячэнне, вентыляцыя і ахова паветранага басейна* (дзённая і завочная: сумесная падрыхтоўка з Полацкім дзяржуніверсітэтам – толькі на дагаворнай аснове) | "Інжынер-будаўнік" | *профільныя* – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова). беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| *Тэхналогія, абсталяванне і аўтаматызацыя машынабудавання* (дзённая і завочная; сумесная падрыхтоўка з Полацкім дзяржуніверсітэтам – толькі на дагаворнай аснове) | "Інжынер-тэхнолаг" або "Інжынер-механік" | *профільныя* – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***Водазабеспячэнне, водаадвядзенне, ачыстка прамысловых і сцёкавых вод*** *(дзённая і завочная: сумесная падрыхтоўка з Полацкім дзяржуніверсітэтам – толькі на дагаворнай аснове)* | "Інжынер-будаўнік" або "Інжынер-тэхнолаг-будаўнік" | ***профільныя*** – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва*** *(дзённая і завочная: сумесная падрыхтоўка з Полацкім дзяржуніверсітэтам – толькі на дагаворнай аснове)* | "Інжынер-будаўнік" | ***профільныя*** – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Машыны і апараты харчовых вытворчасцей*** *(дзённая і завочная: сумесная падрыхтоўка з Магілёўскім дзяржаўным тэхналагічным інстытутам – толькі на дагаворнай аснове)* | "Інжынер-механік" | ***профільныя*** – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцей*** *(дзённая і завочная: сумесная падрыхтоўка з Магілёўскім дзяржаўным тэхналагічным інстытутам – толькі на дагаворнай аснове)* | "Інжынер па аўтаматызацыі" | ***профільныя*** – фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | фізіка (вусна) |
| ***Тэхналогія захавання і перапрацоўкі расліннай сыравіны*** *(дзённая і завочная: сумесная падрыхтоўка з Магілёўскім дзяржаўным тэхналагічным інстытутам – толькі на дагаворнай аснове)* | "Інжынер-тэхнолаг" | ***профільныя*** – хімія (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | хімія (вусна) |
| ***Тэхналогія захавання і перапрацоўкі жывёльнай сыравіны*** *(дзённая і завочная: сумесная падрыхтоўка з Магілёўскім дзяржаўным тэхналагічным інстытутам – толькі на дагаворнай аснове)* | "Інжынер-тэхнолаг" | ***профільныя*** – хімія (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская ці руская мова і літаратура (пераказ) | хімія (вусна) |

**1. Атрымаць бясплатную вышэйшую адукацыю** на конкурснай аснове маюць права грамадзяне Рэспублікі Беларусь і беларусы, якія пражываюць за яе межамі, грамадзяне Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі, а таксама асобы, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь або маюць статус бежанца.

**На навучанне без адрыву ад вытворчасці** (*завочная і вячэрняя бясплатныя формы навучання*) залічэнне правадзіцца таксама па конкурсе. У першую чаргу залічваюцца абітурыенты, якія маюць сярэднюю спецыяльную ці прафесійна-тэхнічную адукацыю або стаж практычнай работы не менш як шэсць месяцаў на 15.08.2000 года і паступаюць на адпаведныя ці роднасныя спецыяльнасці. Іншыя асобы, якія маюць аднолькавы ці вышэйшы бал, могуць залічвацца ў межах 20% ад кантрольных лічбаў прыёму па дадзенай спецыяльнасці.

Пералічаныя катэгорыі асоб маюць права атрымаць на базе сярэдняй адукацыі на конкурснай аснове бясплатную вышэйшую адукацыю, калі адукацыя дадзенага ўзроўню атрымліваецца ўпершыню.

**Прыём заяў для атрымання бясплатнай вышэйшай адукацыі на дзённую форму навучання з 26.06.2000 г. па 15.07.2000 г.; на завочную і вячэрнюю формы навучання — з 5.07.2000 г. па 01.08.2000 г.**

**Уступныя экзамены на дзённую форму навучання з 17.07.2000 г., на завочную і вячэрнюю формы навучання — з 03.08.2000 г.**

**2.** Звыш кантрольных лічбаў прыёму, фінансуемых за кошт бюджэтных сродкаў, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы ажыццяўляе прыём студэнтаў па дзённай, завочнай і вячэрняй формах навучання на падставе дагавораў з аплатай за навучанне юрыдычнымі або фізічнымі асобамі.

**На навучанне на дагаворнай аснове па конкурсе будуць залічвацца** абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ва універсітэт ці іншую ВНУ, пры ўмове здачы адпаведных уступных экзаменаў незалежна ад формы іх правядзення (вусна ці пісьмова), а таксама па сярэднім бале адзнак дакумента аб сярэдняй адукацыі.

**Прыём заяў для ўдзелу ў конкурсе па сярэднім бале ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі на дзённую форму навучання — з 26.06.2000 г. па 12.07.2000 г., на завочную і вячэрнюю формы навучання — з 5.07.2000 г. па 28.07.2000 г. Залічэнне па конкурсе сярэдняга бала ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі адбудзецца напярэдадні ўступных экзаменаў.**

Абітурыенты, якія не будуць рэкамендаваны да залічэння па сярэднім бале ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі на вызначаныя лічбы прыёму па абранай спецыяльнасці, могуць здаваць уступныя экзамены па абранай спецыяльнасці і пры станоўчай іх здачы ўдзельнічаць у конкурсе на залічэнне па выніках экзаменаў.

**3. Прыём заяў для ўдзелу ў конкурсе на дагаворнай аснове** ад абітурыентаў, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ва універсітэт ці іншую ВНУ, а таксама для ўдзелу ў конкурсе на свабодныя месцы ад вызначаных лічбаў прыёму па сярэднім бале адзнак дакумента аб сярэдняй адукацыі **будзе ажыццяўляцца да 23.08.2000 г.**

**4. Дакументы, якія абітурыенты падаюць ці дасылаюць па пошце ў прыёмную камісію універсітэта:**

– заява ўстаноўленага ўзору на імя рэктара;

– дакумент дзяржаўнага ўзору аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале;

– дзяржаўны сертыфікат (для тых, хто прайшоў цэнтралізаванае тэсціраванне);

– 6 чорна-белых фотакартак памерам 3х4;
– медыцынская даведка па форме 086-У;
– выпіска з працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе);
– даведка службы занятасці насельніцтва (для тых, хто знаходзіцца на яе ўліку).

**Абітурыенты, якія паступаюць не ў год атрымання сярэдняй адукацыі, абавязаны прадставіць дакументы, якія пацвярджаюць іх вучобу ці работу за гады, якія папярэднічалі паступленню (дыплом, выпіска з працоўнай кніжкі або даведка службы занятасці насельніцтва ці іншае).**

Могуць быць прадстаўлены дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыентаў на льготы, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, ці сведчаць аб асабістых талентах і здольнасцях абітурыентаў.

Пашпарт або іншае сведчанне асобы, выдадзенае органамі Міністэрства ўнутраных спраў, прад'яўляецца абітурыентам асабіста.

**5.** Уступныя экзамены дзеляцца на профільныя (конкурсныя) і няпрофільныя. Вынікі ацэнкі ведаў абітурыентаў вызначаюцца адзнакамі: «5» (пяць), «4,5» (чатыры з паловай), «4» (чатыры), «3,5» (тры з паловай), «3» (тры), «2» (два).

Уступныя экзамены, акрамя экзаменаў па спецінструменце, спецыяльнасці, тэорыі музыкі і сальфеджыо, кампазіцыі, малюнку, лёгкай атлетыцы, гімнастыцы і плаванні, праводзяцца па праграмах, якія складзены ў адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

***Абітурыенты маюць права здаваць уступныя экзамены на выбар на беларускай ці рускай мове.***

**Абавязковы пісьмовы экзамен па беларускай ці рускай мове і літаратуры,** які праводзіцца па цэнтралізаваных заданнях у вызначаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь фіксаваныя дні, абітурыенты маюць права здаваць на выбар. Выключэннем з'яўляюцца філалагічныя спецыяльнасці, пры паступленні на якія неабходна здаваць гэтыя экзамены па адпаведнай мове.

**Уступныя экзамены па замежнай мове** (англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай) абітурыенты могуць здаваць на выбар, незалежна ад таго, якую замежную мову яны вывучалі ў сярэдняй навучальнай установе. Выключэннем з'яўляюцца спецыяльнасці «сучасныя замежныя мовы», «англійская мова», «нямецкая мова», «французская мова», «гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю «замежныя мовы», пры паступленні на якія абітурыенты здаюць уступны экзамен па замежнай мове ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю.

*6. Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да астатніх экзаменаў і ўдзелу ў конкурсе на залічэнне не дапускаюцца.*

**7. Асобы, узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём,** а таксама тыя, хто скончыў сярэднюю спецыяльную ці прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, пры атрыманні адзнакі «пяць» па вызначаных для медалістаў СШ і выдатнікаў ССНУ ці ПТНУ прафіліруючых прадметах, вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, а пры атрыманні станоўчай адзнакі, меншай за «5» (пяць), здаюць астатнія экзамены.

**8. Пераможцы і прызёры алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету, Еўропы і Рэспублікі Беларусь,** майстры спорту міжнароднага класу, майстры спорту, а таксама пераможцы і прызёры 1999 і 2000 г. Рэспубліканскіх першынстваў сярод школьнікаў і юніёраў пры паступленні на спецыяльнасць «Фізічная культура і спорт» вызваляюцца ад здачы ўступнага экзамена па лёгкай атлетыцы і гімнастыцы з выстаўленнем адзнакі «пяць».

**9. Пераможцы (I, II, III месца) міжнародных і рэспубліканскіх прадметных алімпіяд,** праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1999/2000 навучальным годзе, вызваляюцца ад здачы аднаго з уступных экзаменаў па адпаведным прадмеце з выстаўленнем адзнакі «пяць».

**10. Выпускнікі 2000 года Гродзенскага дзяржаўнага тэхнічнага каледжа** будуць залічвацца па выніках субсеседавання па прадметах фізіка і матэматыка ў межах 20% ад плана прыёму на спецыяльнасці фізіка-тэхнічнага факультэта.

**11. На скарочаны тэрмін завочнай формы навучання па спецыяльнасцях**

«Педагогіка і методыка пачатковага навучання», «Педагогіка і псіхалогія дашкольная» прымаюцца *выпускнікі Гродзенскага, Ваўкавыскага і Лідскага педвучылішч;*

«Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт», «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве», «Фінансы і крэдыт» прымаюцца *выпускнікі Гродзенскага хіміка-тэхналагічнага тэхнікума, Навагрудскага дзяржаўнага гандлёва-эканамічнага каледжа, Гродзенскага Вышэйшага электратэхнічнага прафесійнага вучылішча імя Івана Шчаснага, Гродзенскага Вышэйшага прафесійнага вучылішча лёгкай прамысловасці* згодна з Прыкладным палажэннем аб вучэбна-навуковым аб'яднанні «Вышэйшая навучальная ўстанова — сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова», якое зацверджана загадам Міністра Рэспублікі Беларусь за №66 ад 09.02.1998 г., **у вызначаныя тэрміны ў адпаведнасці з п.п. 1, 2, 3, а папярэдні прыём заяў для ўдзелу ў конкурсе на дагаворнай аснове з аплатай за навучанне па сярэднім бале ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі на спецыяльнасці «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт», «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве», «Фінансы і крэдыт» па 25.03.2000 г.**

**12. Для атрымання другой вышэйшай адукацыі** (паслядоўнай для тых, хто мае вышэйшую адукацыю, і паралельнай для тых, хто атрымлівае першую вышэйшую адукацыю і жадае атрымаць дадатковую адукацыю) па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы будуць прымацца асобы згодна з адпаведным Палажэннем «Аб парадку атрымання другой вышэйшай адукацыі ў вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь».

**Асобы, якія паступаюць ва універсітэт для атрымання другой вышэйшай адукацыі (паслядоўнай або паралельнай), падаюць у прыёмную камісію наступныя дакументы:**

заяву на імя рэктара;

копію дыплома і дадатку да дыплома, якія павінны быць завераны натарыусам для атрымання паслядоўнай другой вышэйшай адукацыі;

згоду рэктара з месца асноўнага навучання для атрымання паралельнай другой вышэйшай адукацыі;

6 фотакартак памерам 3х4;

медыцынскую даведку па форме 086У;

выпіску з працоўнай кніжкі;

для тых, хто атрымаў першую вышэйшую адукацыю на дагаворнай аснове на ўмовах аплаты, - даведку, якая гэта пацвярджае.

**Пашпарт і дыплом з дадаткам (арыгінал) прад'яўляюцца асабіста.**

**Дакументы падаюць ці дасылаюць па пошце ў прыёмную камісію ў вызначаныя тэрміны ў адпаведнасці з п.п. 1, 2, 3.**

**13. Залічэнне на ўсе спецыяльнасці дзённай формы навучання, акрамя спецыяльнасцей, па якіх ажыццяўляецца мэтавая кантрактная падрыхтоўка, праводзіцца па асобным конкурсе сярод выпускнікоў гарадскіх і сельскіх школ прапарцыянальна пададзеным заявам у адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на конкурсных уступных экзаменах.** У тых выпадках, калі конкурсны бал сярод выпускнікоў сельскіх школ аднолькавы або перавышае конкурсны бал сярод выпускнікоў гарадскіх школ, залічэнне праводзіцца па агульным конкурсе.

**Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання па жаданню абітурыента могуць быць залічаны як ацэнка па ўступнаму экзамену ў адпаведнасці з прадстаўленым дзяржаўным сертыфікатам па рускай мове на ўсе спецыяльнасці, а па матэматыцы і фізіцы — на спецыяльнасці фізіка-тэхнічнага і матэматычнага факультэтаў.**

**14.** Абітурыенты, якія станоўча здадуць уступныя экзамены, будуць удзельнічаць у конкурсе на залічэнне ў межах кантрольных лічбаў прыёму за кошт бюджэтных сродкаў фінансавання на спецыяльнасць у адпаведнасці з пададзенай заявай.

**15. Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на** ўступных экзаменах на спецыяльнасці дзённай, завочнай і вячэрняй форм навучання **залічваюцца:**

воіны-інтэрнацыяналісты;

— дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў;

— дзеці з сем'яў ваеннаслужачых або рабочых і служачых, што займалі штатныя пасады ў воінскіх часцях, за-

гінуўшых (памерлых) ці стаўшых інвалідамі ў час праходжання ваеннай службы або працы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памерлых) у мірны час пры праходжанні ваеннай службы;

— дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, загінуўшых (памерлых) або стаўшых інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама загінуўшых (памерлых) у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў;

— інваліды I і II груп, а таксама дзеці-інваліды, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ва універсітэце па абранай спецыяльнасці і якія могуць наведваць заняткі;

— абітурыенты, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС». Абітурыенты гэтай катэгорыі, якія скончылі навучальныя ўстановы з адзнакай (з выдатнымі ацэнкамі), залічваюцца па выніках гутаркі па прадметах уступных экзаменаў;

— беларусы замежжа па рэкамендацыях беларускіх суполак ці навучальных устаноў замежжа на спецыяльна вылучаныя органамі кіравання навучальнымі ўстановамі месцы.

**16.** Пераважнае права на залічэнне па спецыяльнасцях усіх форм навучання пры аднолькавай колькасці балаў маюць:

— інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

— асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС»;

— звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей;

— выпускнікі Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа — пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

— асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш за два гады.

***17. З 1 па 13 ліпеня*** для абітурыентаў ва універсітэце будуць працаваць платныя падрыхтоўчыя курсы па прадметах уступных экзаменаў. Прыём заяў адбудзецца з 26.06.2000 г.

**18. Усе іншыя пытанні, якія могуць узнікнуць у перыяд прыёму дакументаў, правядзення ўступных экзаменаў, залічэння, канчаткова вырашае прыёмная камісія Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.**

**Дакументы накіроўваць на адрас: 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22. Універсітэт, прыёмная камісія (пакой 215), тэлефон 44 51 03.**

***Правілы прыёму ва універсітэт зацверджаны на пасяджэнні прыёмнай камісіі ад 01.02.2000 года (пратакол N2).***

# ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ЎСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ

## ПРЫ ПАСТУПЛЕННІ Ў ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

1. Члены адпаведных прадметных экзаменацыйных камісій у дзень правядзення ўступных іспытаў **збіраюцца ў поўным складзе як правіла ў 8.30 у ауд. 218 (актавая зала).**

2. Старшыня прыёмнай камісіі або яго намеснік перад пачаткам экзаменаў прызначае экзаменатараў у групы і выдае старшыням экзаменацыйных камісій неабходную колькасць камплектаў экзаменацыйных білетаў і варыянтаў пісьмовых заданняў.

3. Прызначаныя ў групы экзаменатары атрымліваюць у адказнага сакратара або ў аднаго з яго намеснікаў неабходную колькасць камплектаў тытульных лістоў і лістоў-укладышаў для выканання пісьмовых работ або лістоў вуснага адказу для правядзення вусных экзаменаў. Усё гэта фіксуецца ў спецыяльным журнале за подпісам экзаменатараў і асобы, якая выдае гэтыя камплекты.

4. Пры правядзенні пісьмовага экзамену варыянт задання вызначаецца жэраб'ёўкай з удзелам абітурыентаў.

5. Прысутнасць на экзаменах пабочных асоб без дазволу старшыні прыёмнай камісіі або яго намесніка не дапускаецца.

6. У аўдыторыі, дзе праводзіцца экзамен, абітурыент прад'яўляе пашпарт або іншае сведчанне асобы, выдадзенае органамі Міністэрства ўнутраных спраў, і экзаменацыйны ліст. Пасля праверкі асобы абітурыента яму прапануецца выцягнуць білет, затым выдаецца бланк ліста вуснага адказу або бланкі тытульнага ліста з укладышамі для выканання пісьмовай работы.

7. Вусныя экзамены кожнага абітурыента прымаюцца двума экзаменатарамі, а экзамен па спецыяльнасці - не менш чым трыма экзаменатарамі (плаванне, гімнастыка, лёгкая атлетыка, спецыяльнасць, спецінструмент, тэорыя музыкі і сальфеджыо, кампазіцыя, малюнак).

8. Адначасова ў аўдыторыі на вусным экзамене могуць прысутнічаць не больш за 5 — 6 абітурыентаў, падрыхтоўка да адказу павінна складаць не больш за 1,5 гадзіны.

9. На вусным экзамене пры падрыхтоўцы да адказу абітурыент абавязкова робіць запісы ў лісце вуснага адказу з штампам навучальнай установы, а экзаменатары адзначаюць правільнасць і паўнату адказаў на пытанні экзаменацыйнага білета і дадатковыя пытанні, якія запісваюцца ў ліст вуснага адказу **экзаменатарам.** Дадатковыя пытанні павінны насіць удакладняльны характар і не выходзіць за межы праграмы.

10. Лісты вуснага адказу пасля экзамену перадаюцца экзаменатарамі адказнаму сакратару або яго намесніку, які нясе асабістую адказнасць за іх захаванне.

11. На ўступных экзаменах павінны быць створаны спакойныя і добразычлівыя абставіны, абітурыенту дадзена магчымасць найбольш поўна выявіць узровень сваіх ведаў і ўменняў.

12. Вынікі ўступных экзаменаў вызначаюцца ацэнкамі: «5» (пяць), «4,5» (чатыры з паловай), «4» (чатыры), «3,5» (тры з паловай), «3» (тры), «2» (два). Адпаведныя крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў зацверджаны ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь.

13. Экзаменацыйная ацэнка ставіцца лічбай і прапісам спачатку ў экзаменацыйную ведамасць, а потым у экзаменацыйны ліст абітурыента і ліст вуснага адказу. Кожная ацэнка па вусным экзамене ў экзаменацыйнай ведамасці, у экзаменацыйным лісце і лісце вуснага адказу падпісваецца ўсімі прызначанымі ў гэтую групу экзаменатарамі.

14. На правядзенне пісьмовага ўступнага экзамену прадугледжваецца 4 гадзіны (240 хвілін) без перапынку, на пісьмовы экзамен па замежнай мове (пісьмова) 90 хвілін, а на дыктоўку адводзіцца 60 хвілін. На вусны экзамен адводзіцца не больш 1/3 акадэмічнай гадзіны (15 хвілін) на аднаго абітурыента.

15. Пісьмовыя экзаменацыйныя работы (у тым ліку чарнавікі) выконваюцца на лістах-укладышах з штампам універсітэта, на якіх недапушчальны ніякія пабочныя паметкі і запісы, і здаюцца экзаменатару.

16. Лісты з штампам навучальнай установы да выдачы іх экзаменатарам знаходзяцца ў адказнага сакратара і падлягаюць строгаму ўліку.

17. Размовы экзаменатараў з абітурыентамі па пытаннях зместу работы на пісьмовых экзаменах не дапускаюцца.

18. Пасля заканчэння экзамену пісьмовыя работы перадаюцца экзаменатарамі адказнаму сакратару прыёмнай камісіі або яго намесніку ў прысутнасці старшыні прадметнай экзаменацыйнай камісіі **непасрэдна** ў аўдыторыі, дзе адбываўся экзамен, аб чым робіцца адпаведны запіс у спецыяльным журнале.

19. Асобы, якія не паспелі выканаць работу поўнасцю, аддаюць іх незакончанай.

20. Пісьмовыя экзаменацыйныя работы правяраюцца пад шыфрам без указання прозвішча абітурыента. Шыфроўку пісьмовых работ праводзіць адказны сакратар прыёмнай камісіі або яго намеснік у пры-

сутнасці аднаго з кіраўнікоў прыёмнай камісіі.

21. Пасля шыфроўкі тытульныя лісты захоўваюцца ў сейфе адказнага сакратара, а лісты-ўкладышы вяртаюцца старшыні экзаменацыйнай камісіі, які размяркоўвае пісьмовыя работы паміж членамі прадметнай экзаменацыйнай камісіі для праверкі.

22. Праверка пісьмовых работ праводзіцца толькі ў памяшканні навучальнай установы і толькі членамі прадметнай экзаменацыйнай камісіі.

23. Старшыня экзаменацыйнай камісіі абавязкова правярае пісьмовыя работы, якія ацэнены экзаменатарамі на «2» (два) і «5» (пяць), а таксама выбарачна 5% астатніх работ, правераных кожным экзаменатарам, і правільнасць адзнакі засведчвае сваім подпісам.

Правераныя пісьмовыя работы, а таксама запоўненыя экзаменацыйныя ведамасці з шыфрамі, ацэнкамі і подпісамі правяраўшых экзаменатараў перадаюцца старшынёй экзаменацыйнай камісіі адказнаму сакратару або яго намесніку, якія праводзяць дэшыфроўку работ і ўпісваюць прозвішчы абітурыентаў. Пасля гэтага ведамасці і экзаменацыйныя лісты перадаюцца старшыні экзаменацыйнай камісіі, які арганізуе ўпісванне адзнакі з ведамасці ў экзаменацыйны ліст абітурыента.

24. Старшыня прадметнай экзаменацыйнай камісіі нясе поўную адказнасць за захаванне парадку ў час праверкі пісьмовых работ.

25. На праверку пісьмовых экзаменацыйных работ адводзіцца: 1 (адна) акадэмічная гадзіна за 4 (чатыры) дыктоўкі або за 3 (тры) пісьмовыя работы па іншых прадметах.

26. Перадача ўступных экзаменаў не дапускаецца. Атрымаўшыя нездавальняючую ацэнку, а таксама тыя, хто не з'явіўся на экзамен без уважлівых прычын, да астатніх экзаменаў і ўдзелу ў конкурсе на залічэнне не дапускаюцца.

Пры наяўнасці ўважлівых прычын, пацверджаных дакументамі, абітурыенты могуць дапускацца да здачы ўступных экзаменаў з дазволу намесніка старшыні прыёмнай камісіі ці адказнага сакратара ў межах вызначаных тэрмінаў правядзення ўступных экзаменаў.

27. Выхад абітурыентаў з аўдыторыі ў час уступнага экзамену без уважлівай прычыны забараняецца.

28. Кожны абітурыент мае права асабіста прагледзець сваю пісьмовую работу незалежна ад атрыманай ацэнкі. Сваю пісьмовую работу абітурыент можа прагледзець у дзень абвяшчэння ацэнкі з 15.00 да 17.00 у прысутнасці старшыні або члена адпаведнай прадметнай камісіі.

Пісьмовая работа абітурыента з асабовай справы выдаецца ў рукі старшыні прадметнай экзаменацыйнай камісіі. Па прызначэнні старшыні прадметнай камісіі экзаменатар гэтай жа камісіі можа даць тлумачэнне памылак, а таксама правільнасці ацэнкі ведаў абітурыента.

29. Апеляцыя па пытанні экзаменацыйнай ацэнкі павінна быць абгрунтавана і падавацца асабіста абітурыентамі адказнаму сакратару або яго намесніку на імя старшыні прыёмнай камісіі ў дзень правядзення вуснага экзамену або ў дзень абвяшчэння ацэнкі па пісьмовым экзамене.

Пры разглядзе апеляцыі абітурыентаў дадатковае іх апытванне не дапускаецца.

Вынікі разгляду апеляцыі паведамляюцца абітурыенту не пазней, чым на наступны дзень пасля яе падачы.

30. Усе выпадкі далейшага змянення выстаўленых экзаменатарамі ацэнак суправаджаюцца пісьмовым абгрунтаваннем апеляцыйнай камісіі, тлумачэннем экзаменатара і зацвярджаюцца рашэннем прыёмнай камісіі.

31. Уся арганізацыйная работа па правядзенні ўступных экзаменаў ажыццяўляецца і кантралюецца адказным сакратаром прыёмнай камісіі і яго намеснікамі.

# ПАРАДАК

## удзелу ў конкурсе на залічэнне ў лік студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы на:

***I. Бясплатную форму навучання па выніках уступных экзаменаў на ўсе спецыяльнасці дзённай, завочнай і вячэрняй форм навучання па:***

**1. Мэтавым прыёме (толькі дзённая форма навучання).**

**2. Па-за конкурсам:**

— воіны-інтэрнацыяналісты;

— дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў;

— дзеці з сем'яў ваеннаслужачых або рабочых і служачых, што займалі штатныя пасады ў воінскіх часцях, загінуўшых (памерлых) ці стаўшых інвалідамі ў час праходжання ваеннай службы або працы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памерлых) у мірны час пры праходжанні ваеннай службы;

— дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, загінуўшых (памерлых) або стаўшых інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама загінуўшых (памерлых) у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў;

— інваліды I і II груп, а таксама дзеці-інваліды, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ва універсітэце па абранай спецыяльнасці і якія могуць наведваць заняткі;

— абітурыенты, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС». Абітурыенты гэтай катэгорыі, якія скончылі навучальныя ўстановы з адзнакай (з выдатнымі ацэнкамі), залічваюцца па выніках гутаркі па прадметах уступных экзаменаў;

— беларусы замежжа па рэкамендацыях беларускіх суполак ці навучальных устаноў замежжа на спецыяльна вылучаныя органамі кіравання навучальнымі ўстановамі месцы.

**3. Па агульным конкурсе:**

**3.1.** Медалісты СШ або выдатнікі ССНУ і ПТНУ на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі, якія атрымалі па вызначаных прафіліруючых прадметах ацэнкі «5» (пяць).

**3.2.** Усе астатнія абітурыенты ў адпаведнасці з колькасцю балаў, якія яны набралі пры станоўчай здачы ўступных экзаменаў.

**Пераважнае права на залічэнне пры іншых роўных умовах маюць:**

- інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

- асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС»;

- звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей;

- выпускнікі Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа — пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

- асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш за два гады.

***II. Платную форму навучання на дагаворнай аснове на ўсе спецыяльнасці дзённай, завочнай і вячэрняй форм навучання па конкурсе:***

абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ва універсітэт;

абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ў іншай ВНУ, пры ўмове здачы адпаведных уступных экзаменаў незалежна ад формы іх правядзення (вусна ці пісьмова);

сярэдняга бала ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі.

**Прыёмная камісія.**

# ПОЛОЖЕНИЕ

## о поощрениях и льготах в оплате за обучение для студентов Гродненского государственного университета имени Янки Купалы, обучающихся на договорной основе

### *1. Общие положения*

1.1. Данное положение призвано стимулировать стремление студентов, занимающихся на договорной основе, к успешной учебе, систематическому и глубокому овладению теоретическими знаниями и практическими навыками по избранной специальности, активному участию в общественной, культурно-массовой, научной и спортивной жизни университета, а также обеспечить социальную поддержку студентов, находящихся в тяжелом материальном положении.

1.2. Данное положение разработано на основании Закона Республики Беларусь «Об образовании в Республике Беларусь», Указа Президента Республики Беларусь от 05.11.1996 г. №453, Положения о порядке заключения договоров на подготовку специалистов и рабочих кадров в учебных заведениях Республики Беларусь, Положения о порядке получения второго высшего образования в высших учебных заведениях Республики Беларусь, а также в соответствии с Правилами внутреннего трудового распорядка Гродненского государственного университета имени Янки Купалы и договорами о подготовке специалистов.

### *2. Формы поощрений для студентов, обучающихся на договорной основе*

2.1. За успехи в учебе, активное участие в научно-исследовательской работе и общественной жизни университета для студентов, обучающихся на договорной основе, могут устанавливаться следующие формы поощрений:

- перевод с платной на бюджетную форму обучения (при наличии вакантных мест);
- снижение размера оплаты за обучение до 50% (на оставшийся период обучения, семестр).

2.2. Форма и размер поощрения зависят от следующих критериев:

- успеваемости студентов;
- участия в научно-исследовательской работе и общественной жизни;
- срока обучения в университете.

2.3. Поощрения не предоставляются следующим категориям студентов:

- имеющим по результатам четырех последних экзаменационных сессий хотя бы одну «неудовлетворительную» оценку, при этом учитываются результаты первой сдачи экзаменов;
- имеющим по результатам двух последних экзаменационных сессий хотя бы одну «удовлетворительную» оценку, при этом учитываются результаты первой сдачи экзаменов;
- имеющим дисциплинарные взыскания за нарушение правил внутреннего распорядка, условий договора на подготовку специалистов, финансовой и учебной дисциплины;
- проходящим первый год обучения в университете.

2.4. Система поощрений носит дифференцированный характер и зависит от срока обучения, при этом снижение оплаты за обучение составляет для:

2.4.1. студентов, проходящих второй год обучения в университете, не более 20%;

2.4.2. студентов, проходящих третий год обучения в университете, не более 30%;

2.4.3. студентов, проходящих четвертый-шестой год обучения в университете, не более 50%.

2.5. Перевод с платной на бюджетную форму обучения (в рамках свободных мест по специальности) допускается только в отношении лучших студентов 2-6 курсов этой же специальности, которые на протяжении как минимум трех сессий занимались на «хорошо» и «отлично», а также принимали активное участие в общественной, культурно-массовой, научной и спортивной жизни университета.

2.6. Студенты, переведенные с платной на бюджетную форму обучения, подлежат обязательному распределению.

2.7. На протяжении учебного года студенты, обучающиеся на договорной основе, могут пользоваться только одной формой поощрения. Поощрение отменяется в случаях:

- получения студентами по результатам экзаменационной сессии «неудовлетворительных» или «удовлетворительных» оценок;
- наложения дисциплинарного взыскания за нарушение правил внутреннего распорядка, условий договора о подготовке специалистов, финансовой или учебной дисциплины.

### *3. Льготы в оплате за обучение*

3.1. С учетом социального и материального положения семьи студента, состояния его здоровья, а также здоровья его родителей в университете предусмотрены следующие льготы в оплате за обучение:

- освобождение от оплаты на 50% (на весь период обучения или один учебный год);
- освобождение от оплаты на 25% (на весь период обучения);
- предоставление академического отпуска в связи с тяжелым материальным положением (не более двух раз на протяжении всего периода обучения).

3.2. Льгота в оплате за обучение в виде освобождения от оплаты на 50% на весь период обучения предоставляется следующим категориям студентов:

- детям-сиротам и детям, оставшимся без опеки родителей;
- воинам-интернационалистам;
- детям из семей военнослужащих или рабочих и служащих, которые занимали штатные должности в воинских частях, погибших (умерших) или ставших инвалидами во время прохождения военной службы или работы в составе Советских войск на территории государств, где велись боевые действия, а также детям из семей военнослужащих, погибших (умерших) в мирное время при прохождении воинской службы;
- детям из семей лиц руководящего и рядового состава органов внутренних дел погибших (умерших) или ставших инвалидами при выполнении служебных обязанностей на территории государств, где велись боевые действия, а также погибших (умерших) в мирное время при выполнении служебных обязанностей;
- инвалидам I и II групп, которым в соответствии с заключением медико-реабилитационных экспертных комиссий не противопоказано обучение в университете по избранной специальности и которые могут посещать занятия;
- имеющим льготы, в соответствии со ст. 18 Закона Республики Беларусь «О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС»;

3.3. Льгота в оплате за обучение в виде освобождения от оплаты на 50% на один учебный год предоставляется студенту:

- в случае смерти одного из родителей во время обучения в университете.

3.4. Льгота в оплате за обучение в виде освобождения от оплаты на 25% на весь период обучения предоставляется следующим категориям студентов:

- белорусам, проживающим на территории других государств, по направлению белорусских обществ или учебных заведений;
- членам многодетных семей (при наличии трех и более детей в возрасте до 18 лет).

3.5. В случае восстановления студента после отчисления из университета за академическую неуспеваемость и другим неуважительным причинам льготы не предоставляются.

3.6. Особые случаи, не урегулированные настоящим Положением, выносятся по предложению начальника СПО на рассмотрение Комиссии по предоставлению поощрений и льгот в оплате за обучение.

**Примечание:**

***За справками о предоставлении поощрений и льгот в оплате за обучение просьба обращаться по адресу: г. Гродно, ул. Ожешко, 22, ком. 322 СПО, тел. 47-03-22.***

# ПАМЯТКА АБІТУРЫЕНТУ

1. Уважліва чытайце Правілы прыёму і ўсе аб'явы па прыёму ва універсітэт у 2000 годзе.

2. **Памятайце, што ўступныя экзамены на ўсе спецыяльнасці дзённай формы навучання пачынаюцца 17.07.2000 года, а завочнай і вячэрняй форм навучання - 03.08.2000 года.**

3. Напярэдадні экзаменаў не забудзьце атрымаць экзаменацыйны ліст у прыёмнай камісіі. Добра засвойце правілы захавання экзаменацыйнага ліста.

4. Перш, чым пазнаёміцца з раскладам экзаменаў, запомніце нумар сваёй групы (ён пазначаны на экзаменацыйным лісце).

5. Не спазняйцеся на ўступны экзамен. Памятайце, што абітурыент, які не з'явіўся на адзін з уступных экзаменаў без уважлівых прычын або атрымаў нездавальняючую ацэнку, да астатніх экзаменаў і ўдзелу ў конкурсе на залічэнне не дапускаецца. Пры наяўнасці уважлівых прычын, пацверджаных дакументамі, абітурыенты могуць дапускацца да здачы ўступных экзаменаў з дазволу намесніка старшыні прыёмнай камісіі ці адказнага сакратара прыёмнай камісіі ў межах вызначаных тэрмінаў правядзення ўступных экзаменаў.

6. Экзамен дазваляецца здаваць толькі адзін раз. Паўторная пераздача забаронена. Перад уступнымі экзаменамі праводзяцца кансультацыі па зместу праграм уступных экзаменаў, арганізацыі апытання, крытэрыях ацэнкі.

7. У выпадку, калі Вы прыйшлі на экзамен і адчулі сябе хворым, паведаміце пра гэта тэхнічнаму сакратару прыёмнай камісіі. Затым звярніцеся за дапамогай у медыцынскую службу. Калі стан Вашага здароўя палепшыўся, неабходна прадставіць у прыёмную камісію медыцынскую даведку аб тым, што Вы хварэлі, і падаць заяву на імя адказнага сакратара прыёмнай камісіі аб дазволе здачы ўступных экзаменаў у межах вызначаных тэрмінаў іх правядзення.

8. Пры ўваходзе ў аўдыторыю, дзе праводзіцца экзамен, абітурыент прад'яўляе пашпарт або іншае сведчанне асобы, выдадзенае органамі Міністэрства ўнутраных спраў, і экзаменацыйны ліст.

9. Памятайце, што для пісьмовага экзамену Вам спатрэбіцца ручка з сінім ці фіялетавым чарнілам або шарыкавая ручка з адпаведным стрыжнем.

10. Экзаменацыйны ліст пасля пісьмовага экзамену Вы зможаце атрымаць у прыёмнай камісіі ў вызначаны дзень. Тым, хто на экзамене атрымаў ацэнку «2», экзаменацыйны ліст не выдаецца.

11. Пры падрыхтоўцы да адказу на вусным экзамене абітурыент **абавязкова** робіць запісы ў лісце вуснага адказу са штампам навучальнай установы. Гэтыя лісты застаюцца ў экзаменатараў і здаюцца імі ў прыёмную камісію.

12. Пасля здачы апошняга экзамену экзаменацыйны ліст неабходна адразу ж вярнуць у прыёмную камісію.

13. **Медалісты СШ або выпускнікі ССНУ і ПТНУ на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі, якія здалі прафіліруючыя прадметы па абранай спецыяльнасці ў адпаведнасці са структурай уступных экзаменаў на ацэнкі «5» (пяць), здаюць экзаменацыйны ліст у прыёмную камісію.**

14. **Сваю пісьмовую работу абітурыент можа праглядзець у дзень абвяшчэння ацэнкі з 15.00 да 17.00 у прысутнасці старшыні або члена адпаведнай прадметнай экзаменацыйнай камісіі.**

15. Абітурыент можа падаць апеляцыю наконт экзаменацыйнай ацэнкі ў дзень абвяшчэння ацэнкі па экзамене на імя старшыні прыёмнай камісіі. Апеляцыя па пытанню экзаменацыйнай ацэнкі павінна быць абгрунтавана і падавацца асабіста абітурыентам.

16. Перад уступнымі экзаменамі і пасля іх будуць праводзіцца сходы з абітурыентамі. Запрашаем Вас прыняць удзел.

**Жадаем поспехаў!**

*Прыёмная камісія.*

# КОНКУРС

**па спецыяльнасцях у ГрДУ за 1997-1999 гады (дзённая бюджэтная форма навучання)**

| № п.п | Назва спецыяльнасці | Конкурс 1997 год | 1998 год | 1999 год |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Англійская мова і сучасныя зам.мовы | 2,57 | 2,18 | 2,4 |
| 2. | Біялогія | 1,4 | 1,93 | 1,555 |
| 3. | Беларуская мова і літаратура | 2 | 2,58 | 2,479 |
| 4. | Выяўленчае мастацтва і чарчэнне | 2 | 2,3 | 1,533 |
| 5. | Гісторыя | 2,2 | 2,62 | 2,044 |
| 6. | Гісторыя з дад. спец. англ. мова | – | 2,4 | 2,333 |
| 7. | Гісторыя з дад. спец. нямецкая мова | – | 1,7 | 1,6 |
| 8. | Камерцыйная дзейнасць | 2,12 | 3,7 | 3,25 |
| 9. | Класічныя мовы і антычная літаратура | – | 1,8 | |
| 10. | Матэматыка | 1,87 | 1,52 | 1,6 |
| 11. | Музыка і спевы | 1,8 | 1 | 1,799 |
| 12. | Народная творчасць | 1,5 | 1,1 | 1,2 |
| 13. | Нямецкая мова | 1,67 | 1,84 | 1,6 |
| 14. | ПіМПН з дад. спец. музыка і спевы | 0,67 | 1,43 | 1 |
| 15. | ПіМПН з дад. спец. сац. педагогіка | 1,94 | 2,05 | 1,674 |
| 16. | ПіМПН з дад. спец. выяўленч. маст. | 1,08 | 2,13 | 1,25 |
| 17. | Правазнаўства | 5,3 | 3,88 | 3,147 |
| 18. | Праграмнае забесп.інфарм. тэхнал. | 2,32 | 1,6 | 1,959 |
| 19. | Прыборабудаванне і ТіАВПАН | 1,43 | 1,28 | 2,075 |
| 20. | Прыкладная матэматыка | – | 1,95 | 3 |
| 21. | Псіхалогія | 2,69 | 2,97 | 3,167 |
| 22. | Руская мова і літаратура | 1,68 | 1,44 | 1,899 |
| 23. | Славянскія мовы і літаратуры | 1,95 | 2,6 | 2,849 |
| 24. | Сусветная эканоміка і МЭА | 3,28 | 2,7 | 2,5 |
| 25. | Фізічная культура і спорт | 2,13 | 2,21 | 2 |
| 26. | Фізіка і радыёфізіка | 1,43 | 1,24 | 1,271 |
| 27. | Французская мова | 1,5 | 1,3 | 1,899 |
| 28. | Экалогія | 1,41 | 2,27 | 2,062 |
| 29. | Эканамічная кібернетыка | 1,7 | 2,05 | 2,2 |
| 30. | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве | – | 3,3 | 3,75 |
| | Усяго | 2,13 | 2,14 | 2,15 |

# ПАРАДАК

## падачы і разгляду апеляцыі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы

1. Парадак падачы і разгляду апеляцыі аб'яўляецца разам з Правіламі прыёму на рэкламным стэндзе. **Абітурыенты абавязаны** з ім азнаёміцца да пачатку ўступных экзаменаў.

2. Кожны абітурыент мае права **асабіста** азнаёміцца са сваёй пісьмовай работай незалежна ад атрыманай ацэнкі ў дзень абвяшчэння ацэнкі з 15.00 да 17.00 гадзін у прысутнасці старшыні або члена адпаведнай прадметнай экзаменацыйнай камісіі.

3. Апеляцыя па пытанні экзаменацыйнай ацэнкі павінна быць **абгрунтавана** і падавацца **асабіста абітурыентам** адказнаму сакратару або яго намесніку на імя старшыні прыёмнай камісіі ў дзень правядзення вуснага экзамену або ў дзень абвяшчэння ацэнкі па пісьмовым экзамене. У апеляцыі абавязкова павінна быць тлумачэнне таго, з чым не згодзен абітурыент пры ацэнцы яго ведаў.

4. Апеляцыя разглядаецца на пасяджэнні прадметнай экзаменацыйнай камісіі ў прысутнасці не менш як 2/3 членаў, уключаючы старшыню прадметнай экзаменацыйнай камісіі. Дадатковае апытванне **абітурыентаў пры разглядзе апеляцыі забараняецца!**

Рашэнне прымаецца галасаваннем і афармляецца пратаколам за подпісам старшыні і ўсіх прысутных членаў прадметнай экзаменацыйнай камісіі. Пры гэтым правамоцным лічыцца меркаванне большасці прысутных членаў камісіі.

5. Вынікі разгляду апеляцыі паведамляюцца абітурыенту не пазней, чым на наступны дзень пасля яе падачы.

6. Усе выпадкі далейшага змянення выстаўленых экзаменатарамі ацэнак суправаджаюцца пісьмовым абгрунтаваннем апеляцыйнай камісіі, тлумачэннем экзаменатара і зацвярджаюцца рашэннем прыёмнай камісіі.

*Прыёмная камісія.*

# ПРАХАДНЫ БАЛ

**па спецыяльнасцях у ГрДУ за 1997-1999 гады (дзённая бюджэтная форма навучання)**

| № п/п | Спецыяльнасць | Прахадны бал | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1997 год | 1998 год | 1999 год | | |
| | | Агульнага конкурсу | Агульнага конкурсу | Агульнага конкурсу | Выпускнікоў горада | Выпускнікоў сяла |
| 1. | Англійская мова і сучасныя зам. мовы | 18 | 17,5 | 17 з 20 | | |
| 2. | Біялогія | 9 | 10,5 | 9 з 15 | | |
| 3. | Беларуская мова і літаратура | 15 | 12 | 11,5 з 15 | | |
| 4. | Выяўленчае мастацтва і чарчэнне | 20 | 19,5 | 18 з 25 | | |
| 5. | Гісторыя | 11,5 | 12 | 11,5 з 15 | | |
| 6. | Гісторыя з дад. спец. англ. мова | — | 12 | 12,5 з 15 | | |
| 7. | Гісторыя з дад. спец. нямецкая мова | — | 11 | 10,5 з 15 | | |
| 8. | Камерцыйная дзейнасць | 10,5 | 12 | | 13 з 15 | 5 з 5 (мед.) |
| 9. | Класічныя мовы і антычная літаратура | — | 10,5 | | | |
| 10. | Матэматыка | 11 | 10,5 | 11 з 15 | | |
| 11. | Музыка і спевы | 15,5 | 13 | 14,5 з 20 | | |
| 12. | Народная творчасць | 14 | 13 | 13,5 з 20 | | |
| 13. | Нямецкая мова | 17 | 17,5 | 15 з 20 | | |
| 14. | ПіМПН з дад. спец. музыка і спевы | 12 | 12,5 | 13 з 20 | | |
| 15. | ПіМПН з дад. спец. сац. педагогіка | 11,5 | 11 | 10 з 15 | | |
| 16. | ПіМПН з дад. спец. выяўленч. маст. | 12 | 15,5 | 12,5 з 20 | | |
| 17. | Правазнаўства | 12,5 | 12,5 | | 12,5 з 15 | 12 з 15 |
| 18. | Праграмнае забесп. інфарм. тэхнал. | 12 | 13,5 | | 11,5 з 15 | 11,5 з 15 |
| 19. | Прыборабудаванне і ТіАВПАН | 10,5 | 10 | | 10,5 з 15 | 10,5 з 15 |
| 20. | Прыкладная матэматыка | — | 11 | | 12,5 з 15 | 12,5 з 15 |
| 21. | Псіхалогія | 11,5 | 12 | 13 з 15 | | |
| 22. | Руская мова і літаратура | 11 | 10,5 | 10 з 15 | | |
| 23. | Славянскія мовы і літаратуры | 14 | 11,5 | 11,5 з 15 | | |
| 24. | Сусветная эканоміка і МЭА | 13 | 13 | | 13 з 15 | 13,5 з 15 |
| 25. | Фізічная культура і спорт | 16,5 | 17,5 | 17 з 20 | | |
| 26. | Фізіка і радыёфізіка | 10,5 | 11,5 | 12 з 15 | | |
| 27. | Французская мова | 14 | 13,5 | 16,5 з 20 | | |
| 28. | Экалогія | 9 | 11,5 | 12,5 з 15 | | |
| 29. | Эканамічная кібернетыка | 11 | 12,5 | | 11,5 з 15 | 12 з 15 |
| 30. | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве | — | 12,5 | | 13,5 з 15 | 5 з 5 (мед.) |

## ПАВАЖАНЫЯ АБІТУРЫЕНТЫ!

**Памятайце!** Залічэнне ў лік студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы ажыццяўляецца на:

1. *Бясплатную форму навучання за кошт бюджэтных сродкаў на ўсе спецыяльнасці дзённай, завочнай і вячэрняй форм навучання* толькі па выніках паспяховай здачы ўступных экзаменаў.

2. *Платную форму навучання на дагаворнай аснове на ўсе спецыяльнасці дзённай, завочнай і вячэрняй форм навучання па:*

— конкурсе — абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ва універсітэт;

— конкурсе — абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ў іншай ВНУ, пры ўмове здачы адпаведных уступных экзаменаў незалежна ад формы іх правядзення (вусна ці пісьмова);

— конкурсе сярэдняга бала ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі.

**Выбар за Вамі!**

**Жадаем поспехаў!**

*Прыёмная камісія.*

## ПАВАЖАНЫЯ АБІТУРЫЕНТЫ!

*Прыём дакументаў на бясплатную форму навучання па выніках уступных экзаменаў* будзе праводзіцца на спецыяльнасці:

дзённай формы навучання

**з 26.06.2000 г. па 15.07.2000 г.**

завочнай і вячэрняй форм навучання

**з 5.07.2000 г. па 1.08.2000 г.**

*Уступныя экзамены ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю пачнуцца па спецыяльнасцях:*

дзённай формы навучання

**з 17.07.2000 г.**

завочнай і вячэрняй форм навучання

**з 03.08.2000 г.**

*Прыёмная камісія.*

## ПАВАЖАНЫЯ АБІТУРЫЕНТЫ!

***Прыём дакументаў на платную форму навучання на дагаворнай аснове на ўсе спецыяльнасці:***

**дзённай формы навучання па:**

— конкурсе сярод абітурыентаў, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ва універсітэт ці іншую ВНУ, пры ўмове здачы адпаведных уступных экзаменаў незалежна ад формы іх правядзення (вусна ці пісьмова) **з 05.08.2000 г. па 23.08.2000 г.;**

— конкурсе сярэдняга бала ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі **з 26.06.2000 г. па 12.07.2000 г.**

**завочнай і вячэрняй форм навучання па:**

— конкурсе сярод абітурыентаў, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на бясплатную форму навучання ва універсітэт ці іншую ВНУ, пры ўмове здачы адпаведных уступных экзаменаў незалежна ад формы іх правядзення (вусна ці пісьмова) **з 15.07.2000 г. па 23.08.2000 г.;**

— конкурсе сярэдняга бала ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі **з 05.07.2000 па 28.07.2000г.**

**Залічэнне на ўсе спецыяльнасці дзённай, завочнай і вячэрняй форм навучання па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб сярэдняй адукацыі адбудзецца напярэдадні ўступных экзаменаў.**

***Майце на ўвазе!*** Калі застануцца свабодныя месцы пасля залічэння на вызначаныя лічбы прыёму на дагаворнай аснове з аплатай за навучанне па выніках уступных экзаменаў або па конкурсе сярэдняга бала ацэнак дакумента аб сярэдняй адукацыі, прыёмная камісія **будзе ажыццяўляць прыём заяў па конкурсе сярэдняга бала ацэнак аб сярэдняй адукацыі да 23.08.2000 г.**

*Прыёмная камісія.*

*Рэдактар* Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.

Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ.**

*Фота:* **Ул.САРОКІН.**

*Карэктура:* **Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 24.04.2000.*

*Падпісана да друку: 28.04.2000. 15.00*

*Заказ № 140*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.

Наклад 1000 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* 230023, г.Гродна, Вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.